# Гісторыя. Памяць. Будучыня

***Каманда навучэнцаў Азёрскай дзяржаўнай санаторнай школы-інтэрната Гродзенскага раёна пад кіраўніцтвам намесніка дырэктара па выхаваўчай рабоце Наталлі Леанідаўны Піцко ўдзельнічае ў абласным інфармацыйна-адукацыйным інтэрнэт-праекце "#Гісторыя#Памяць#Будучыня.by", прысвечаным 75-годдзю Вялікай Перамогі, які праходзіць у рамках рэспубліканскай патрыятычнай акцыі "Беларусь памятае".***

Наша каманда пад назвай "РУБЕЖ" паспяхова прайшла рэгістрацыю ў праекце, падрыхтавала і размясціла свой постар-матыватар па тэме праекта, удзельнікі каманды прайшлі анкетаванне ў воблачных тэхналогіях "Адносіны моладзі да падзей Вялікай Айчыннай вайны".

Віртуальнае фотападарожжа "Мая малая радзіма: яўрэйскае мястэчка Азёры ў даваенны час" стала вынікам выканання першага задання на першай пляцоўцы "Памяці ахвяр Халакосту". Даследчая работа каманды "РУБЕЖ" займае дастойнае месца сярод работ 66 каманд Гродзенскага рэгіёна.

Паспяхова выканана і чарговае заданне: намі пастаўлены меткі на сумесна створанай Google-карце Гродзенскай вобласці "Месцы памяці ахвяр Халакосту", размешчаны фотаздымкі помнікаў ахвярам нацызму на тэрыторыі Азёрскага сельсавета і дадзена інфармацыя па іх.

Найвышэйшы бал каманда атрымала і за наступнае заданне: мы сабралі матэрыял аб праведніках у Гродзенскім раёне, тэкставыя ўспаміны відавочцаў пра дапамогу яўрэйскаму насельніцтву ў гады Вялікай Айчыннай вайны, 21 слайд нашай каманды размешчаны ў сумеснай Google-прэзентацыі "Праведнікі народаў свету ў Гродзенскай вобласці".

Цяпер наша каманда "РУБЕЖ" пачала работу над стварэннем сцяны памяці "Вайна ў маёй сям'і".

**Наталля ПІЦКО,**
**намеснік дырэктара**
**па выхаваўчай рабоце**
**Азёрскай дзяржаўнай**
**санаторнай школы-інтэрната**
**Гродзенскага раёна.**